# ПЫТАННЕ АБ БЕЛАРУСКАЙ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ МЕНШАСЦІ Ў ПОЛЬШЧЫ Ў БЕЛАРУСКАЙ ДЫПЛАМАТЫІ ПАЧАТКУ 1990-х гг.

**Д. А. Драбовіч[1)], У. Е. Снапкоўскі[2)]**

*[1)] Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт,*
*пр. Незалежнасці, 4, 220030, г. Мінск, Беларусь, daniildrabovich@gmail.com*
*[2)] Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт,*
*пр. Незалежнасці, 4, 220030, г. Мінск, Беларусь, snap@bsu.by*

Артыкул аналізуе беларуска-польскія перамовы ў першай палове 1990-х гг. з асаблівай увагай да пытання правоў нацыянальных меншасцей і дзяржаўных межаў. Аб'ектам з'яўляецца палітыка кіраўніцтва Беларусі, дыпламатычныя перамовы і юрыдычныя пагадненні, што ўплывалі на ўзаемаадносіны дзвюх краін. Пасля абвяшчэння суверэнітэту Беларусі Мінск адмовіўся падпісаць дэкларацыю аб нязменнасці межаў, спасылаючыся на становішча беларускай меншасці ў Польшчы. Польская палітыка дэкларавала імкненне пазбягаць канфліктаў з суседзямі, у той час як Беларусь адстойвала правы сваіх суайчыннікаў. Актуальнасць тэмы абумоўлена неабходнасцю даследавання палітычных і прававых механізмаў урэгулявання праблем нацыянальных меншасцей. Артыкул мае практычнае значэнне для разумення кірункаў міждзяржаўных пытанняў.

***Ключавыя словы:*** беларуска-польскія адносіны; нацыянальныя меншасці; дзяржаўныя межы; Дагавор аб добрасуседстве; Беласточчына; перамовы.

# THE ISSUE OF THE BELARUSIAN NATIONAL MINORITY IN POLAND IN BELARUSIAN DIPLOMACY OF THE EARLY 1990s

**D. Drabovich[a], U. Snapkouski[b]**

*[a] Belarusian State University,*
*4 Niezaliezhnasci Avenue, Minsk 220030, Belarus, daniildrabovich@gmail.com*
*[b] Belarusian State University,*
*4 Niezaliezhnasci Avenue, Minsk 220030, Belarus, snap@bsu.by*

The article analyzes Belarusian-Polish negotiations in the first half of the 1990s, with a particular focus on the issues of national minority rights and state borders. The subject of study includes the policies of the Belarusian leadership, diplomatic negotiations, and legal agreements that influenced the relations between the two countries. Following Belarus's declaration of sovereignty, Minsk refused to sign a declaration on the inviolability of borders, citing concerns about the status of the Belarusian minority in Poland. While Poland's policy declared its desire to avoid conflicts with its neighbors, Belarus sought to defend the rights of its compatriots. The relevance of the topic is determined by the need to examine the political and legal mechanisms for resolving national minority issues. The article has practical significance for understanding the directions of interstate relations.

***Keywords:*** Belarusian-Polish relations; national minorities; state borders; Treaty on Good Neighborliness; Białystok; negotiations.

# ВОПРОС О БЕЛОРУССКОМ НАЦИОНАЛЬНОМ МЕНЬШИНСТВЕ В ПОЛЬШЕ В БЕЛОРУССКОЙ ДИПЛОМАТИИ НАЧАЛЕ 1990-х гг.

**Д. А. Дробович[1)], В. Е. Снапковскй[2)]**

*1) Белорусский государственный университет,*
*пр. Независимости, 4, 220030, г. Минск, Беларусь, daniildrabovich@gmail.com*
*2) Белорусский государственный университет,*
*пр. Независимости, 4, 220030, г. Минск, Беларусь, snap@bsu.by*

Статья анализирует белорусско-польские переговоры в первой половине 1990-х гг. с особым вниманием к вопросу прав национальных меньшинств и государственных границ. Объектом является политика руководства Беларуси, дипломатические переговоры и юридические соглашения, которые влияли на взаимоотношения двух стран. После провозглашения суверенитета Беларуси Минск отказался подписать декларацию о неизменности границ, ссылаясь на положение белорусского меньшинства в Польше. Польская политика декларировала стремление избегать конфликтов с соседями, а Беларусь отстаивала права своих соотечественников. Актуальность темы обусловлена необходимостью исследования политических и правовых механизмов урегулирования проблем национальных меньшинств. Статья имеет практическое значение для понимания направлений межгосударственных вопросов.

**Ключевые слова:** белорусско-польские отношения; национальные меньшинства; государственные границы; договор о добрососедстве; Белосточчина; переговоры.

Пасля абвяшчэння суверэнітэту Беларусі Польша стала адной з першых краін, якая яго прызнала [1, с. 212]. Адна з найбольш важных падзей у двухбаковых стасунках з Польшчай у гэты час – гэта адмова Мінска ў кастрычніку 1990 г. падпісаць сумесную дэкларацыю, якая прызнавала існуючыя межы паміж Беларуссю і Польшчай. Прычынай была незадаволенасць становішчам беларускай меншасці ў Польшчы, у першую чаргу на Беласточчыне.

Мэтай артыкула з'яўляецца аналіз беларуска-польскіх перамоў пачатку 1990-х гг. у кантэксце пытання правоў нацыянальных меншасцей, што дазваляе выявіць палітычныя і прававыя механізмы іх урэгулявання. Двухкаляёвая палітыка Польшчы таго часу адносна Беларусі была разгледжана ў даследаваннях такіх беларускіх аўтараў, як У. Е. Снапкоўскі, М. Э. Часноўскі, Л. А. Козік, а таксама у працах польскіх даследчыкаў, сярод якіх трэба назваць такіх як К. Федаровіч [2], А. Уладарчык [3], С. Белень, К. Малак, М. Менкішак, Я. Міраповіч, М. Піатровускі, М. Сянкевіч.

23 кастрычніка 1990 г. падчас візіту міністра замежных спраў Польскай Рэспублікі К. Скубішэўскага ў Мінск міністр замежных спраў Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі П. К. Краўчанка абмеркаваў пытанне становішча беларусаў у Польшчы. Перамовы былі асабліва напоўненыя драматызмам. Каб прыняць удзел у сустрэчы, П. К. Краўчанка быў вымушаны перапыніць сваё знаходжанне на 45-й сесіі Генеральнай Асамблеі ААН у Нью-Ёрку. На перамовах ён падымаў праблему прыналежнасці

Беласточчыны, выказваючы незадавальненне адносна палітыкі польскіх улад да беларускай нацыянальнай меншасці, а таксама прадставіў ідэю аб стварэнні ў Польшчы этнічнай беларускай акругі [4, с. 182]. П. К. Краўчанка выказаўся супраць прапанаванай Польшчай Дэкларацыі аб асновах міждзяржаўных адносін, нягледзячы на тое, што аналагічныя дакументы былі ўжо падпісаны з Украінай і Расіяй. Прызнаць межы азначала для Мінска з прававога боку прызнаць дзеянне савецка-польскага Дагавора аб дзяржаўнай мяжы 1945 г., які Беларусь не падпісвала. Падчас перамоў беларускія ўлады цвёрда выказалі сваю пазіцыю: яны не маглі прыняць фармулёўкі аб недатыкальнасці і нязменнасці мяжы, якая была ўстаноўлена пасля Другой сусветнай вайны [5].

У адказ К. Скубішэўскі выказаў шкадаванне з нагоды ўзніклай праблемы, але адзначыў, што для вырашэння гэтых пытанняў будзе неабходны час. Ён таксама адмовіўся працягваць дыскусію пра мяжу, падкрэсліваючы важнасць захавання яе нязменнасці ў будучыні. Цікава, што спачатку К. Скубішэўскі нават не прызнаваў, што беларускі бок вылучаў тэрытарыяльныя прэтэнзіі, і толькі ў 2009 г. паведаміў, што абмяркоўвалася пытанне адносна Беласточчыны [2, с. 226–227]. Артыкул аб нязменнасці ўсталяванай мяжы у 1945 г. быў прыняты ў версіі, прапанаванай польскім бокам падчас першай спробы падпісаць дэкларацыю ў 1990 г. [6, с. 228]

Памежнае пытанне было канчаткова вырашана ў рамках Дагавора аб добрасуседстве і дружалюбным супрацоўніцтве, у якім абедзве краіны прызналі непарушнасць існуючых межаў. Дагавор быў падпісаны 23 чэрвеня 1992 г. у Варшаве старшынёй Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь С. С. Шушкевічам і прэзідэнтам Польшчы Л. Валенсай. Дагавор аказаў вялікі ўплыў на пытанне нацыянальных меншасцей абедзвюх краін. Ён складаўся з 29 артыкулаў, 5 з якіх прысвечаны падтрымцы меншасцей і супрацоўніцтву ў гэтай сферы.

Важна адзначыць, што згодна польскай гістарыяграфіі палітыка К. Скубішэўскага ў адносінах да Усходу была накіравана на стварэнне стабільных і бяспечных адносін з суседнімі дзяржавамі, што, у сваю чаргу, павінна было паспрыяць рэалізацыі амбіцый Польшчы ў дасягненні заходніх мэт. Польская дыпламатыя ў сувязі з гэтым дэкларавала імкненне мінімізаваць любыя канфлікты і праблемы з суседзямі, асабліва з Беларуссю, Літвой, Украінай. Адным з асноўных пытанняў, якія маглі прывесці да напружанасці, з'яўлялася становішча польскай нацыянальнай меншасці ў гэтых рэгіёнах. У праграме К. Скубішэўскага, як адзначае А. Уладарчык, забеспячэнне правоў палякаў на Усходзе не было ўключана як умова нармалізацыі адносін з гэтымі краінамі [3, с. 215–216]. К. Скубішэўскі не падтрымліваў ідэю пераўтварэння гэтага пытання ў асобную тэматыку двухбаковых перамоў, прапануючы замест гэтага разглядаць правы меншасцей як частку агульнага кантэксту правоў чалавека. Для забеспячэння іх рэалізацыі ён бачыў адну гарантыю – міжнароднае права. Гэта падыход адлюстраваўся ў дагаворах Польшчы з суседзямі ў 1990–1994 гг., якія ў сваіх раздзелах аб правах меншасцей апіраліся на міжнародныя стандарты.

У кантэксце глабальных сацыяльна-эканамічных і палітычных змен, якія адбыліся ў жыцці абодвух народаў, узаемасувязі паміж імі развіваліся актыўна, хоць і сутыкаліся з шэрагам складанасцяў. Але на дзяржаўным узроўні, пачынаючы з другой паловы 1990-х гг., гэтыя сувязі пачалі абмяжоўвацца ў сувязі з істотнымі адрозненнямі ў палітыцы дзвюх дзяржаў [7, с. 235].

У выніку праблема становішча беларусаў і праваслаўнай царквы ў Польшчы адышла на другі план у міждзяржаўных адносінах. У той жа час назіраліся працэсы паскоранай асіміляцыі польскіх беларусаў, развіцця іх рэгіянальнай праваслаўнай ідэнтычнасці ў межах Польшчы, а таксама адчувальнага аддзялення ад гістарычнай радзімы. Праблемы нацыянальных меншасцей паступова саступілі месца іншым пытанням і супярэчнасцям у беларуска-польскіх адносінах. На першы план выйшлі праблемы знешнепалітычнай арыентацыі Мінска і Варшавы, а таксама пытанні эканамічнага і гуманітарнага супрацоўніцтва. Дагаворна-прававое ўрэгуляванне праблемы нацыянальных меншасцей было далейшае закладзена ў Пагадненні аб супрацоўніцтве ў галіне культуры, навукі і адукацыі, падпісаным 27 лістапада 1995 г. У другой палове 1990-х гг. пытанні нацыянальных меншасцей яшчэ фігуравалі ў беларуска-польскіх адносінах, але іх актуальнасць значна зменшыліся.

## БІБЛІЯГРАФІЧНЫ СПІС


1. Снапкоўскі, У. Е. Перыядызацыя беларуска-польскіх адносін у 1944–1991 гг. / У. Е. Снапкоўскі // Беларусь і суседзі: шляхі фарміравання дзяржаўнасці, міжнацыянальныя і міждзяржаўныя адносіны : зборнік навуковых артыкулаў / Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, Установа адукацыі «Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Ф. Скарыны». – 2014. – Вып. 3. – С. 210–214.
2. Fedorowicz, K. Polityka Polski wobec Rosji, Ukrainy i Białorusi w latach 1989–2010 / K. Fedorowicz. – Poznań : Wydawnictwo Naukowe UAM, 2011. – 342 s.
3. Białoruś w koncepcji polskiej polityki wschodniej Krzysztofa Skubiszewskiego w latach 1990–1993 // Беларускі гістарычны зборнік. – 2018. – № 50. – С. 203–218.
4. Снапкоўскі, У. Е. Шлях скрозь стагоддзе: беларуска-польскія адносіны 1918–2017 гг. / У. Е. Снапкоўскі. – Мінск : БДУ, 2017. – 287 с.
5. Snapkowski, W. Stosunki polsko-białoruskie (1990–2003) / W. Snapkowski // Беларусь і Польшча = Polska i Białoruś. – Warszawa, 2003. – S. 17–26.
6. Кравченко, П. К. Беларусь на переломе: дипломатический прорыв в мир: выступления, статьи, интервью, беседы, дипломатические документы и переписка / П. К. Кравченко. – Минск : БИП-С Плюс, 2009. – 634 с.
7. XX стагоддзе ў гісторыі палякаў і беларусаў : матэрыялы беларуска-польскай навуковай канферэнцыі., Мінск, 20–21 лістапада 2000 г. / рэдкал.: У. Міхнюк, П. Гарнцарэк (адказныя рэдактары) [і інш.]. – Мінск : БДУ, 2001. – 236 с.